# Зубр

ЧАМУ зубр абраны адным з сімвалаў Беларусі? Паводле якіх падстаў? Пераважная большасць насельнікаў нашай краіны ніколі не бачыла яго ў натуры і ведае пра яго толькі з апісанняў літаратараў і навукоўцаў, з фотаздымкаў ды з тэлеэкрана. А выява гэтай аграмаднай жывёліны з горбам пад загрыўкамі, з вялізнымі рагамі ўвайшла ў эмблему Мінскага аўтазавода. (Яго прадукцыя — аўтамабілі «МАЗ» — таксама сімвал Беларусі.) Мо таму, што зубры — самыя вялікія жывёліны ва ўсёй Еўропе. Яны знаходзяцца ў пэўным сваяцтве з сучаснымі каровамі і быкамі. І вельмі падобныя між сабою, адрозніваюцца памерамі і ўмовамі існавання (каровы і быкі прыручаны жыць пад наглядам чалавека). Карову мы добра ведаем і называем карміліцай, клапоцімся пра яе. Прыязныя адносіны да свойскіх жывёл пераносім і на дзікіх, у т.л. і на зуброў — магутных і таямнічых для нас жывёлін.

Зубр вылучаецца сярод іншых ,і ясных жыхароў. Даўжыня яго цела дасягае 3,5 метраў, вышыня (у карку) — да 2 метраў, а вага — каля тоны і болей. У зубра вельмі магутная пярэдняя частка тулава, але галава невялікая, шыя кароткая і тоўстая. ніводны драчежнік не адважыцца напасці на яго (у мінулым былі выпадкі нападу мядзведзяў). Поўсць адносна кароткая, але перад зімой робіцца густой, бурай.

Жывуць зубры статкам (20—30 асобін) у лісцевых і змешаных лясах. Галоўная ў ім — старая спрактыкаваная зубрыца. Яна добра ведае, што рабіць: дзе выбраць мясціну з разнатраўем, куды весці на вадапой, як уладкавацца на адпачынак. Увосень статак пераходзіць у дубровы, змешаныя лясы, дзе можна падсілкавацца парасткэмі, карою дрэў. Зімою жывёлы разграбаюць снег, каб дабрацца да чарнічніку, верасу, выходзяць да стагоў, што ў лугавінах паблізу лесу, да бульбяных буртоў на полі.(Узапаведніках зуброў падкормліваюць сенам, бульбай, буракамі, морквай, травяной мукой.)

Зубры не мычаць, як каровы, не равуць, не выдаюць моцных гукаў. Яны не агрэсіўныя, не нападаюць. Але калі раззлуюцца, то носам моцна ўцягваюць паветра, а гукі, якія атрымліваюцца, нагадваюць рохканне свіней.

Зубраняткі з'яўляюцца на свет вясною, пераважна ў маі. Перад гэтым зубрыца пакідае статак і ўбаку ад яго целіцца. Спачатку зубраня корміцца малаком маці, а потым паступова, да канца першага месяца, пераходзіць на маладую сакавітую траву. Увесь час зубрыца пільна сочыць за паводзінамі дзіцяці і за наваколлем. Яна разюшана кідаецца на ўсё, што рухаецца вакол іх. Маладняк дасягае палавой спеласці ў 3—4 гады. Нараджаецца звычайна адно цяля. Многія зубрыцы целяцца адзін раз у два гады. Жывуць зубры да 25—30 гадоў...

А мо таму зубр і стаў сімвалам нашай зямлі, што ўзнаўляўся ён у мінулым стагоддзі ў Белавежскай пушчы.

Лёс зубра склаўся драматычна. Паўтаралася гісторыя жывёл, якія жылі ў нашым краі, але зніклі. У мінулым зубры вадзіліся паўсюль на Беларусі. У канцы XVIII ст. засталіся толькі ў Белавежскай пушчы (ды за межамі нашай краіны — на Паўночным Каўказе). Яшчэ напачатку XX ст. у ёй налічвалася больш за 700 галоў. У час ваенных падзей яны амаль усе былі знішчаны. Апошняга зубра ў Белавежы забілі ў 1919 г., на Каўказе — у 1927-м.

Перад духоўна заклапочанай грамадскасцю Еўропы паўстала вострая праблема — адрадзіць зуброў у натуральных умовах (бо ў заапарках засталося яшчэ 56 асобін). Узнаўленне праводзілася ў спецыяльных гадавальніках у Белавежскай пушчы (Польшча), а пазней у запаведніках Расіі, Украіны, на Каўказе. У 1946 г. на беларускую тэрыторыю Белавежскай пушчы (яна мае плошчу 150 тыс. га, з іх каля палавіны ў Беларусі) перадалі пяць зуброў з Польшчы. Цяпер іх тут ужо больш за тры сотні (а ўсяго на Беларусі — больш за чатыры). Адсюль зуброў вывезлі ў Бярэзінскі запаведнік, Прыпяцкі заказнік і іншыя рэгіёны рэспублікі, у суседнія краіны...

Магутная, прыгожая жывёліна з серпападобнымі рагамі ды з грываю на карку і махровай барадой знайшла адлюстраванне ў літаратурных і мастацкіх творах, маляўнічых фотаальбомах. Дзіцячы пісьменнік Васіль Вітка напісаў займальную “Казку пра цара зубра”.

***Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН***

**Источник:** Пралеска.-2009.-№6.-С.60.